Галоўнае ўпраўленне па адукацыі
Брэсцкага аблвыканкама
ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ІНСТЫТУТ
РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ"
вул. Я.Купалы, 20/1, 224020, г. Брэст
тэл./ факс 35 42 99
эл. адрас: mail@boiro.by

Главное управление по образованию
Брестского облисполкома
ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ
ОБРАЗОВАНИЯ
"БРЕСТСКИЙ ОБЛАСТНОЙ НСТИТУТ
РАЗВИТИЯ ОБРАЗОВАНИЯ"
ул. Я.Купалы, 20/1, 224020, г. Брест
тэл./ факс 35 42 99
эл. адрес: mail@boiro.by

24.02.2020 № 01-10/277

Начальнікам аддзелаў (упраўленняў) па адукацыі райгарвыканкамаў

Аб правядзенні конкурсу

Накіроўваем інфармацыю пра арганізацыю і правядзенне 2 і 3 тураў трэцяга этапа конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў "Настаўнік года Рэспублікі Беларусь" (далей – конкурс), а таксама некаторых арганізацыйна-метадычных мерапрыемстваў.

**1.** Пераможцамі 1 тура – удзельнікамі 2 тура сталі канкурсанты, якія набралі большую колькасць балаў пры ацэньванні журы прадстаўленых на конкурс матэрыялаў. Паведамляем, што аргкамітэт не ўпаўнаважаны каментаваць рашэнні журы. Спіс удзельнікаў 2 тура па ўсіх намінацыях – у Дадатку 1 да гэтага пісьма. **Нагадваем пра неабходнасць вызначэння для кожнага канкурсанта-ўдзельніка 2-3 тураў двух куратараў** (напрыклад: адзін – па пытаннях методыкі выкладання вучэбнага прадмета, другі – "сцэнічны іміджмейкер", пастаноўшчык сцэнічнага выступлення, кіраўнік групы падтрымкі), **якія павінны суправаджаць канкурсанта падчас яго ўдзелу ў 2 і 3 турах** (загад галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама № 96 ад 11.02.2020).

**2.** Плануемы графік правядзення 2 і 3 тураў – у Дадатку 2 да гэтага пісьма.

**3.** Паведамляем зацверджаную **тэму публічнага выступлення канкурсантаў: "Сэрцам адданыя роднай зямлі…"**. Публічнае выступленне, такім чынам, прадугледжвае прэзентацыю асэнсавання настаўнікам:

– ролі настаўніцтва і адукацыі ў сучасным свеце,
– сваёй прафесійнай дзейнасці дзеля будучыні Беларусі,
– сябе, як чалавека, грамадзяніна, патрыёта сваёй Радзімы.

Публічнае выступленне кожнага канкурсанта павінна быць цалкам або часткова **на беларускай мове**.

**4.** Паведамляем, што **28 лютага 2020 года** на базе ДУА “Брэсцкі абласны ІРА” адбудзецца **ўстановачны семінар** для канкурсантаў–удзельнікаў 2 тура конкурсу ў адпаведнасці з Дадаткам 1. Пры неабходнасці (па рашэнні аддзела ці ўпраўлення па адукацыі) разам з канкурсантам для ўдзелу ў семінары можа быць накіраваны адзін з яго куратараў. Пачатак семінара – 10.30, актавая зала інстытута. Рэгістрацыя ўдзельнікаў – з 09.00 у памяшканні музейнай экспазіцыі. Для ўдзелу ў семінары ў якасці лектараў запрашаюцца наступныя работнікі:

Пратасевіч Алена Барысаўна, настаўнік матэматыкі ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Драгічына”;

Лазіцкая Ала Мікалаеўна, дырэктар ДУА “Сярэдняя школа №2 г.Століна”;

Грыцук Наталля Мацвееўна, настаўніца геаграфіі ДУА ”Жамчужненская сярэдняя школа” Баранавіцкага раёна.

Камандзіровачныя выдаткі за кошт арганізацый, якія накіроўваюць.

**5.** Паведамляем, што **03 сакавіка 2020 года** ў памяшканні музейнай экспазіцыі ДУА “Брэсцкі абласны ІРА” адбудзецца **інструктыўна-метадычная нарада** кіраўнікоў устаноў адукацыі, на базе якіх будуць праводзіцца 2 і 3 туры конкурса. Пачатак – 09.00. Для ўдзелу ў нарадзе запрашаюцца загадчыкі вучэбна-метадычных кабінетаў Ленінскага і Маскоўскага раёнаў г.Брэста, кіраўнікі наступных устаноў адукацыі.

Камандзіровачныя выдаткі за кошт арганізацый, якія накіроўваюць.

Рэктар інстытута А.В. Машчук

Электронны варыянт адпавядае арыгіналу
12 Карпук 98 06 93

ДАДАТАК 1

Спіс пераможцаў 1 тура – удзельнікаў 2 тура трэцяга этапа
конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў
“Настаўнік года Рэспублікі Беларусь”
(пералік **у алфавітным парадку**)

## Намінацыя “Выхавацель дашкольнай адукацыі”

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Жидаль | Диана | Ивановна | Воспитатель дошкольного образования | ГУО "Жемчужненский ясли-сад" Барановичского р-на |
| 2 | Литвинюк | Галина | Владимировна | Воспитатель дошкольного образования | ГУДО "Дошкольный центр развития ребенка г.Барановичи" |
| 3 | Прокопюк | Ольга | Александровна | Воспитатель дошкольного образования | ГУО "Ясли-сад №44 г.Бреста" |
| 4 | Рыжко | Юлия | Васильевна | Воспитатель дошкольного образования | ГУО "Ясли-сад №27 г.Бреста" |
| 5 | Савицкая | Юлия | Анатольевна | Воспитатель дошкольного образования | ГУО "Пинковичский ясли-сад Пинского района" |
| 6 | Чернюк | Татьяна | Николаевна | Воспитатель дошкольного образования | ГУО "Ясли-сад № 19 г.Пинска" |

## Намінацыя “Пачатковыя класы”

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Базар | Наталья | Николаевна | Учитель начальных классов | ГУО «Колоднянский учебно-педагогический комплекс ясли-сад базовая школа» Столинского района |
| 2 | Дядюк | Наталья | Петровна | Учитель начальных классов | ГУО "УПК ясли-сад-начальная школа № 6 г.Бреста" |
| 3 | Кучинская | Татьяна | Федоровна | Учитель начальных классов | ГУО "Гимназия г.Дрогичина" |
| 4 | Лицкевич | Татьяна | Леонидовна | Учитель начальных классов | ГУО "Гимназия № 5 г.Барановичи" |
| 5 | Потеруха | Ольга | Михайловна | Учитель начальных классов | ГУО "Средняя школа №4 г.Пружаны" |
| 6 | Пригодич | Людмила | Константиновна | Учитель начальных классов | ГУО "Средняя школа №16 г.Пинска" |

## Намінацыя “Замежныя мовы”

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Кухарчук | Светлана | Александровна | Учитель немецкого языка | ГУО "Средняя школа № 2 г.Иваново" |
| 2 | Молош | Татьяна | Александровна | Учитель английского языка | ГУО "Средняя школа № 4 г.Ивацевичи" |
| 3 | Олихвер | Тамара | Игоревна | Учитель английского языка | ГУО "Гимназия №3 имени В.З.Коржа г.Пинска" |
| 4 | Самойлович | Ольга | Сергеевна | Учитель английского языка | ГУО "Гимназия г.Пружаны" |
| 5 | Трояновская | Марина | Валентиновна | Учитель английского языка | ГУО "Средняя школа № 3 г.Ганцевичи" |
| 6 | Шухова | Светлана | Евгеньевна | Учитель английского языка | ГУО "Гимназия №2 г.Барановичи" |

## Намінацыя “Музыка, выяўленчае мастацтва, мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура), працоўнае навучанне, чарчэнне, фізічная культура і здароўе, дапрызыўная падрыхтоўка”

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гордейчик | Виктор | Владимирович | Учитель допризывной подготовки | ГУО "Средняя школа № 2 г.Березы" |
| 2 | Гордиевская | Татьяна | Васильевна | Учитель физической культуры и здоровья | ГУО "Гимназия г.Пружаны" |
| 3 | Дубовская | Инга | Васильевна | Учитель искусства | ГУО "Средняя школа №16 г.Пинска" |
| 4 | Сокол | Андрей | Николаевич | Учитель физической культуры и здоровья | ГУО "Средняя школа №2 г.Ляховичи" |
| 5 | Цырельчук | Ирина | Владимировна | Учитель искусства | ГУО "Вороцевичский УПК детский сад-средняя школа" Ивановского района |
| 6 | Ярмольчик | Наталья | Симоновна | Учитель трудового обучения | ГУО "Лунинская ясли-сад - средняя школа" Лунинецкого р-на |

## Намінацыя “Беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура”

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Дробышева | Инна | Васильевна | Учитель русского языка и литературы | ГУО "Гимназия г.Иваново" |
| 2 | Елизарова | Жанна | Евгеньевна | Учитель русского языка и литературы | ГУО "Гимназия г.Кобрина" |
| 3 | Емельянова | Ирина | Васильевна | Учитель русского языка и литературы | ГУО "Средняя школа №4 г.Ивацевичи" |
| 4 | Олешко | Елена | Станиславовна | Учитель белорусского языка и литературы | ГУО "Средняя школа № 10 г.Барановичи" |
| 5 | Прастакевич | Светлана | Константиновна | Учитель русского языка и литературы | ГУО "Гимназия г.Ляховичи" |
| 6 | Ясеня | Наталья | Михайловна | Учитель русского языка и литературы | ГУО "Средняя школа № 1 г.Микашевичи" Лунинецкого р-на |

## Намінацыя “Фізіка, астраномія, матэматыка, інфарматыка”

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Дмитрук | Ольга | Викторовна | Учитель физики | ГУО "Средняя школа №3 г.Жабинки" |
| 2 | Лось | Татьяна | Николаевна | Учитель математики | ГУО "Гимназия г.Иваново" |
| 3 | Некрашевич | Николай | Николаевич | Учитель физики | ГУО "Средняя школа №15 г.Пинска" |
| 4 | Онуфриюк | Елена | Васильевна | Учитель математики | ГУО "Средняя школа №2 г.Жабинки" |
| 5 | Пригодич | Татьяна | Константиновна | Учитель физики | ГУО "Средняя школа №14 имени Е.М.Фомина г.Бреста" |
| 6 | Стаскевич | Галина | Адамовна | Учитель информатики | ГУО "Средняя школа №3 г.Ивацевичи" |

## Намінацыя “Хімія, біялогія”

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Бакунец | Светлана | Валерьевна | Учитель биологии | ГУО "Средняя школа №26 г.Бреста" |
| 2 | Ильючик | Нина | Семеновна | Учитель биологии | ГУО "Средняя школа №2 г.Лунинца" |
| 3 | Левчук | Анна | Владимировна | Учитель биологии и химии | ГУО "Хидринский УПК ясли-сад-средняя школа" Кобринского р-на |
| 4 | Маринчик | Светлана | Федоровна | Учитель биологии | ГУО "Средняя школа №14 г.Пинска" |
| 5 | Мисюк | Татьяна | Леонидовна | Учитель биологии | ГУО "Средняя школа №2 г.Ляховичи" |
| 6 | Пригодич | Николай | Константинович | Учитель биологии и химии | ГУО "Молотковичская средняя школа" Пинского района |

## Намінацыя “Гісторыя, грамадазнаўства, геаграфія”

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Козак | Дмитрий | Николаевич | Учитель географии | ГУО "Жидченская средняя школа" Пинского района |
| 2 | Маклюк | Татьяна | Владимировна | Учитель истории | ГУО "Средняя школа №14 г.Барановичи" |
| 3 | Невдах | Ромуальд | Федорович | Учитель истории и общество-ведения | ГУО "Средняя школа №17 г.Пинска" |
| 4 | Побожная | Ирина | Владимировна | Учитель географии и биологии | ГУО "Стригинская средняя школа" Березовского района |
| 5 | Рутич | Галина | Михайловна | Учитель истории | ГУО "Средняя школа №1 имени В.Х.Головко г.Березы" |
| 6 | Шабан | Вячеслав | Леонтьевич | Учитель истории | ГУО "Леснянская средняя школа" Барановичского района |

ДАДАТАК 2

Плануемы графік правядзення
2 і 3 тураў трэцяга этапа конкурсу прафесійнага майстэрства
педагагічных работнікаў
"Настаўнік года Рэспублікі Беларусь"

Панядзелак (09.03.2020, 16.03.2020) – заезд, атрыманне тэмы ўрока, знаёмства з настаўнікам, школай, кабінетам.

Аўторак (10.03.2020, 17.03.2020) – псіхолага-педагагічнае тэсціраванне, падрыхтоўка ўрока.

Серада (11.03.2020, 18.03.2020) – правядзенне ўрока, самааналіз, адказы на пытанні журы (па 3-5 пытанняў кожнаму канкурсанту).

Чацвер (12.03.2020, 19.03.2020) – правядзенне майстар-класа (45 хвілін) для педагогаў свайго вучэбнага прадмета (не больш за 20 удзельнікаў-слухачоў).

Пятніца (13.03.2020, 20.03.2020) – публічнае выступленне (да 7 хвілін) і прэсавая канферэнцыя (па 3 пытанні кожнаму канкурсанту), ад'езд.